(школы, кружки, курсы и семинары, клубы по интересам). На данном уровне библиотечного обслуживания активно используются новые технологи. Всем нам известна и применяема такая форма работы как библиографический обзор. В последнее время все чаще встречается виртуальный обзор, который представлен на сайте библиотеки или же размещен в качестве заставки на экране компьютера.

Из форм работы коммуникативного уровня, необходимо отметить библиотечные уроки. В ВГУ имени П.М.Машерова для студентов первых курсов проводятся занятия по основам библиотечно-библиографических знаний. В качестве дополнительного материала по программе занятий на сайте библиотеки размещены методические рекомендации «Рациональные приемы работы с книгой», которые позволяют студентам самостоятельно освоить такие темы как быстрое чтение, работа с текстом, письменная организация материала. Материал сопровождает тест, который позволяет проверить насколько он хорошо усвоен.

**Заключение.** В данном сообщении освещены инновационные формы и методы работы с книгой, которые нашли применение в практике научной библиотеки. Коллектив библиотеки стремится к освоению новых форм работы с книгой. В ближайшем будущем планируется предложить читателям мультиформатное мероприятие, создать страничку библиотеки в социальных сетях и таким образом привлечь внимание к книге и библиотеке и многое другое. Таким образом, инновационные формы работы с книгой имеют место в работе современной библиотеки и позволяют библиотеке соответствовать информационным запросам пользователей.

Список литературы

1. Гусева, Е.Н. Инновации в библиотеках страны: подходы, проблемы, проекты / Е. Н. Гусева // Библиотечное дело – XXI век. – 2010. – N 1 (19). – С. 93-109.

## ВЫДАТНЫ ЗНАЎЦА ВІЦЕБСКАГА КРАЮ

*М.В. Півавар*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

У 2012 г. пайшоў з жыцця вядомы краязнаўца, актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця, аўтар шэрага кніг і соцень артыкулаў, прысвечаных гісторыі і культуры Віцебска і Віцебскага раёна – Дзмітрый Раманавіч Газін.

Мэта работы: акрэсліць асноўныя накірункі дзейнасці славутага даследчыка Віцебшчыны, падвесці вынікі яго працы, аддаць даніну павагі руплівому краязнаўцу.

**Матэрыял і метады**. Некаторым аспектам жыццёвага шляху і дзейнасці даследчыка прысвечаны артыкулы ў кнізе "Памяць" і мясцовым перыядычным друку [1]. У кнізе "Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы XX – пач. XXI ст." прыведзена бібліяграфія яго прац [2]. Пры правядзенні даследавання выкарыстоўвалі згаданыя крыніцы, а таксама вусныя паведамленні і анкеты, якія захоўваюцца ў асабістым архіве аўтара.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Дзмітрый Раманавіч Газін нарадзіўся 17 верасня 1928 г. у в. Сакольнікі Бараўлянскана с/с Віцебскага раёна. Вучыўся ў Мазалаўскай школе Віцебскага раёна. У гады Вялікай Айчыннай вайны фашысты знішчылі ўсю сям'ю, аднак хлопчык змог уратавацца і нават некаторы час выконваў абавязкі сувязнога партызанскага атрада. З 1950 па 1953 гг. Дзмітрый Раманавіч служыў у Савецкай Арміі. Працаваў інжынерам-механікам, загадчыкам ка-



Репозиторий ВГУ

мунальнага аддзела райвыканкама Чыгуначнага раёна г. Віцебска, старшынёй упраўлення жыллёвай гаспадаркі Віцебскага гарвыканкама. Працуючы, Дз.Р. Газін скончыў у 1964 г. сярэднюю школу працоўнай моладзі, а ў 1970 г. Беларускі інстытут чыгуначнага транспарту. Член Савета Віцебскай гарадской арганізацыі ветэранаў. З 1953 г. пражываў у Віцебску.

Цікавіцца гісторыяй роднага краю Дзмітрый Раманавіч пачаў з юнацтва. У 1946 г. у мясцовым перыядычным друку з'явілася яго першая публікацыя, а з 1960-х гадоў у газетах "Чыгуначнік Беларусі", "Віцебскі рабочы" пастаяннымі сталі артыкулы напісаныя на розныя тэмы з гісторыі краю, прафесійнага і грамадскага жыцця Віцебшчыны: пра выбітных людзей, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, вынікі сацыялістычнага спаборніцтва і іншыя тэмы. Для падрыхтоўкі артыкулаў аўтар пачаў сістэматычна працаваць у Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна, Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці. З мэтай назапашвання факталагічнага матэрыялу пачаў праводзіць апытанне мясцовых жыхароў, што прывяло да пашырэння тэматыкі даследаванняў гісторыі краю.

Найбольш цікавай для аўтара стала гісторыя Віцебскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны, галоўным чынам партызанская барацьба, жыццё і дзейнасць землякоў і выдатных дзеячаў краю. Найбольш увагі ён надаваў паўночнай частцы Віцебскага раёна – Мазалаўскаму, Курынскаму, Запольскаму сельскім саветам.

Да найбольш значных вынікаў працы Дз.Р. Газіна аднясем удзел у аднаўленні і захаванні памяці пра Лужаснянскі канцэнтрацыйны лагер, дзе у гады Вялікай Айчыннай вайны ўтрымліваліся савецкія ваеннапалонныя і мірныя жыхары. У выніку гэтых дзеянняў лагер атрымаў статус "лагер на лініі фронту", а былыя вязні магчымасць атрымліваць кампенсацыйныя выплаты з Германіі. Дзмітрый Раманавіч стаў ініцыятарам усталявання ахоўнага знака на курганным могільніку каля в. Сакольнікі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна, памятнага знака на месцы былога маёнтка А.П. Сапунова "Кахоўка" каля в. Сакольнікі (1998). У 2005 г. ён стаў ініцыятарам усталявання мемарыяльнага знака ў гонар Дзвінскага маста (цяпер Кіраўскі мост) ў г. Віцебск. Аказваў дапамогу ў стварэнні экспазіцый ў музеі Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова, музея Віцебскага аддзялення Беларускай чыгункі, экспазіцыі прысвечанай А.П. Сапунову ў Мазалаўскай СШ Віцебскага раёна [3]. Удзельнічаў у шэрагу канферэнцый, у тым ліку "90 гадоў ВВАК" (Віцебск, 1998), "150 гадоў А.П. Сапунову" (Віцебск, 1999).

У выніку падзвіжніцкай працы Дз.Р. Газіна былі напісаны шэраг брашур і кніг па гісторыі Віцебскага раёна: "Мазалаўская Швейцарыя", "Вярхоўскія парогі-перакаты", "Цірасполькія шляхі-дарогі", "Сапуновские сокровища", "Лужеснянские страницы", "По репинским местам Придвинья", "Пылал Придвинский край" і некаторыя іншыя [4]. У газетах "Народнае слова", "Віцебскі рабочы", "Віцьбічы", "Жыццё Прыдзвіння" (Віцебскі раён), "Сцяг працы" (Лёзна), "Голас Сенненшчыны", "Герой працы" (Шуміліна) і шэрагу іншых раённых выданняў Газін змясціў больш за 500 артыкулаў на краязнаўчую тэматыку.

Ім былі падрыхтаваны да друку, але пакуль чакаюць выдаўца працы: "Успенское взгорье" (прысвечана падзеям войн 1812 г. і 1941–1945 гг.), "Сын своего времени" (пра героя Грамадзянскай вайны Шубіна І.Ф.); "Вымнянская жемчужина" (пра Тадулінскі манастыр); "На огненной черте" (падзеі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Мазалаўскага, Курынскага, Заронаўскага с/с. Віцебскага раёна); некаторыя іншыя матэрыялы прысвечаныя гісторыі Віцебскага раёна.

Рэпазіторый ВДУ

Дзмітрый Раманавіч актыўна супрацоўнічаў з Дзяржаўным архівам Віцебскай вобласці, Віцебскім абласным аддзяленнем Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, фондам імя А.П. Сапунова. Асабліва добрыя сувязі складваліся ў яго з Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна, кіраўніцтва якой дапамагло выдаць некаторыя кнігі.

За ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне і сваю плённую прафесійную працу Дз.Р. Газін быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, знакам "Ударник сталинского призыва" (1948), юбілейнымі медалямі ў гонар перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

**Заключэнне**. Такім чынам, Дзмітрый Раманавіч Газін з'яўляўся актыўным ўдзельнікам грамадскага жыцця Віцебшчыны, зрабіў значны ўклад у вывучэнні гісторыі і культуры Віцебска і Віцебскага раёна, які мае важнае значэнне для сучасных даследчыкаў. У асабістым архіве нашчадкаў краязнаўцы застаюцца нявыдадзенымі працы, якія варта пасля навуковай апрацоўкі надрукаваць у асобным зборніку.

Спіс літаратуры


1. Краязнаўцы Віцебскага раёна // Памяць: Віцебскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Уклад. У.І. Мезенцаў. – Мн.: Маст. літ., 2004. – С. 723; Кузьміч Т. Газін Д.Р. // Віцебскі рабочы. – 1997. – № 88. – С. 2; Вихров А. Знаменитое не может исчезнуть // Віцебскі рабочы. – 1999. – 30 студзен. – С. 2.
2. Газін Дзмітрый Раманавіч // Півавар, М.В. Краязнаўцы Віцебшчыны 2-й пал. XX – пач. XXI ст. / М.Півавар. – Мінск: Кнігазбор, 2010. – С. 63–66.
3. Анкета "Краязнаўцы Віцебшчыны". Газін Д.Р. (10.03.2006) // Захоўваецца ў асабістым архіве Півавара М.В.
4. Вярхоўскія парогі-перакаты. – Віцебск: друк. імя Камінтэрна, 1994. – 14 с.; Мазалаўская Швейцарыя. – Віцебск: друк. імя Камінтэрна, 1992. – 8 с.; Ціраспальскія шляхі-дарогі. – Віцебск: друк. імя Камінтэрна, 1995. – 18 с.; Сапуновские сокровища. – Витебск: Витебская областная укрупненная типография, 1998. – 42 с.; Лужеснянские страницы. – Витебск: Витебская областная библиотека, 2002. – 94 с.; По репинским местам Придвинья. – Витебск: ВОТ, 2003. – 80 с.; Пылал Придвинский край: Рассказы о войне / Предисл. И.А. Шишковой. – Витебск: ВОТ, 2005. – 144 с.


## АНТРОПОМОРФНЫЕ ЧЕРТЫ ОБРАЗА МАТЕРИ-СЫРОЙ ЗЕМЛИ У ВОСТОЧНЫХ СЛАВЯН


*О.И. Пушкина*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


Одной из проблем современности человека является утрата культурной идентичности. Глобализационные процессы, огромные информационные потоки и мозаичность восприятия окружающего мира приводят к тому, что человек теряет связь с культурой своего народа, своей страны. С целью укрепления национального сознания белорусов, на наш взгляд, более пристальное внимание следует уделить изучению особенностей духовной культуры восточных славян. Мифология является одной из наиболее древних систем, в которой был зафиксирован социокультурный опыт предыдущих поколений. Мифологическая картина мира ориентировала человека не только в пространственно-временной, но и в аксиоло-



Репозиторий ВГУ